# XXVI ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ «МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ»

***МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ***

***(МІНСК, 19 КРАСАВІКА 2018 ГОДА)***

19 красавіка 2018 г. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Рэспубліканскі фонд братоў Гарэцкіх і Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ладзілі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «XXVI Гарэцкія чытанні». У гэтым годзе мерапрыемства было прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння М. Гарэцкага – класіка айчыннага прыгожага пісьменства, аўтара «Гісторыі беларускае літаратуры» – знакавага для айчыннай навукі і педагагічнай практыкі выдання, грамадска-палітычнага дзеяча, які працаваў на ніве нацыянальнага Адраджэння.

З уступным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнулася Н. Кальцова – намеснік дырэктара па навуковай рабоце Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, з прывітальным словам выступіў А. Бутэвіч – пісьменнік, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

У межах канферэнцыі праводзілася прэзентацыя кнігі «Макскім Гарэцкі. Вернасць высокім ідэалам», што пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» (*Гарэцкі, М. Вернасць высокім ідэалам: успаміны, аповесці, апавяданні, запіскі / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2018. – 319 с.*). Кніга складаецца з двух раздзелаў: «Вянок памяці» і «Скарбы жыцця». У першай частцы сабраны ўспаміны родных (Гаўрылы, Галіны і Парфіра Гарэцкіх, Леанілы Чарняўскай-Гарэцкай) і знаёмых (Ю. Гаўрука, М. Улашчыка, А. Якімовіча і інш.) пісьменніка, якія назаўжды захапіліся чалавечымі якасцямі і творчымі здольнасцямі мастака слова. Другая частка дазваляе пазнаёміцца з выбранай прозай аўтара: апавяданнямі «Літоўскі хутарок», «Габрыелевы прысады», «Усебеларускі з’езд 1917-га года», «Максімава зязюля», аповесцю «Дзве душы», дакументальна-мастацкімі запіскамі «На імперыялістычнай вайне», фрагментам з філасофска-алегарычнага твора «Скарбы жыцця». Кніга багата ілюстравана, у тым ліку прадстаўлены фотаздымкі з архіва акадэміка НАН Беларусі Р. Гарэцкага.

На пленарным паседжанні з грунтоўнымі дакладамі выступілі Р. Гарэцкі («Супадзенне юбілееў: Максім Гарэцкі і Беларуская Народная Рэспубліка»), З. Драздова («“Камароўская хроніка” Максіма Гарэцкага: мова, стыль, псіхалагізм»), А. Чарнавокая («Мастацкая проза Леанілы Чарняўскай у кантэксце эпохі (да 125-годдзя з дня нараджэння Л. Чарняўскай (Гарэцкай)») і Т. Тарасава («Нацыянальнае пытанне ў творах Максіма Гарэцкага 1920-х гадоў»).

Далей праца канферэнцыі працягнулася на дзвюх секцыях, дзе з дакладамі выступілі вядучыя спецыялісты ў галіне гарэцказнаўства (Т. Ганчарова-Цынкевіч, Т. Грамадчанка, В. Губская, А. Гурская, Т. Дасаева, Д. Дудзінская, Г. Кажамякін, І. Лапцёнак, Т. Мацюхіна, В. Маршэўская, З. Мельнікава, З. Трацця, І. Часнок, А. Ярмоленка). Міждысцыплінарнасць секцый абумоўлена сучаснымі тэндэнцыямі да сінтэзу розных навук у вывучэнні творчых здабыткаў мастакоў слова. Была праведзена дыскусія па пытаннях, што датычыліся прадстаўленых дакладаў.

Канфэрэнцыя скончылася выступамі арганізатараў, якія падвялі вынікі працы і вызначылі перспектывы вывучэння спадчыны Гаўрылы і Максіма Гарэцкага. Удзельнікі ўсклалі кветкі да помніка М. Гарэцкаму.

***канд. філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***